УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па навучальнай працы
ўстановы адукацыі
«Мінскі дзяржаўны лінгвістычны
ўніверсітэт»
_________________А.П. Бяценя
«_29_» _____іюня_____ 2023 г.
Рэгістрацыйны № _________

# МАСТАЦКІ ТЭКСТ У ГІСТАРЫЧНЫМ КАНТЭКСЦЕ

Вучэбная праграма ўстановы адукацыі вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці
7-06-0232-02 «Літаратуразнаўства»

2023

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарта вышэйшай адукацыі II ступені па спецыяльнасці 7-06 0232-02 «Літаратуразнаўства», зацверджанага пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 31.05.2023 № 163 і вучэбнага плана МДЛУ па спецыяльнасці 7-06 0232-02 «Літаратуразнаўства».


**СКЛАДАЛЬНІК:**
М. А. Курыпка, загадчык кафедрай другой замежнай мовы (англійская) ўстановы адукацыі «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт», кандыдат філалагічных навук.


**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
М. М. Воінава-Страха, загадчык кафедрай беларускай мовы і літаратуры ўстановы адукацыі «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт», кандыдат філалагічных навук, дацэнт.

Н. Л. Сяржант, дацэнт кафедры беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт ім. М.Танка», кандыдат філалагічных навук, дацэнт.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт» (пратакол № 10 ад 30.05.2023 г.);

Навукова-метадычным саветам ўстановы адукацыі «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт»
(пратакол № 10 ад 29.06.2023 г.)

# I. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма па дысцыпліне «Мастацкі тэкст у гістарычным кантэксце» прызначана для рэалізацыі адукацыйнага працэсу на другой ступені вышэйшай адукацыі ў межах цыкла спецыяльных дысцыплін.

Якасць прафесіянальнай падрыхтоўкі лінгвістаў залежыць не толькі ад іх трывалых ведаў замежнай мовы як сродка прафесійнай дзейнасці, але і ад валодання сацыяльна-асобаснымі і гуманітарнымі кампетэнцыямі, якія патрабуюць ведання такіх дысцыплін, як літаратуразнаўства, бо яно змяшчае ў сабе культурны код і генетычную памяць нацыі і абумоўлена нацыянальнымі, гістарычнымі і сацыяльнымі стэрэатыпамі мыслення, уласцівымі кожнаму народу. Далучэнне магістрантаў да багаццяў сусветнай літаратуры дапаможа ў фарміраванні іх светапогляду і сацыяльна-творчага вопыту, развіцці эстэтычнага кругагляду, выхаванні мастацкага густу

**Мэта вывучэння вучэбнай дысцыпліны** – авалоданне навыкамі ўспрымання і разумення ідэйна-тэматычнай, вобразнай і эстэтычнай спецыфікі мастацкага тэксту ў гістарычным і сацыякультурным кантэксце эпохі для выканання навукова-даследчай дзейнасці.

Асноўнымі задачамі вывучэння вучэбнай дысцыпліны з'яўляецца:

– сфарміраваць у магістрантаў уяўленне аб важнейшых этапах і заканамернасцях развіцця заходнееўрапейскай літаратуры ад Антычнасці да эпохі Асветніцтва;

– развіць у навучэнцаў навыкі выяўлення ідэйна-маральнага і эстэтычнага значэння выбітных мастацкіх твораў розных літаратурных эпох;

– засвоіць методыку вызначэння сувязяў мастацкага твору як з літаратурным, так і з пазалітаратурным кантэкстам;

– садзейнічаць фарміраванню ў магістрантаў навыкаў цэласнага і глыбокага аналізу мастацкага тэксту ў кантэксце асэнсавання яго гістарычнай, філасофскай і культурнай значнасці.

У сістэме падрыхтоўкі спецылістаў з вышэйшай адукацыяй у адпаведнасці з вучэбным планам накірунку спецыяльнасці 7-06 0232-02 «Літаратуразнаўства» вучэбная дысцыпліна «Мастацкі тэкст у гістарычным кантэксце» з'яўляецца дысцыплінай кампанету УВА.

У агульнай сістэме прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў па замежнай літаратуры змест вучэбнай дысцыпліны «Мастацкі тэкст у гістарычным кантэксце» узаемазвязаны з наступнымі дысцыплінамі:

– «Метадалогія літаратуразнаўчага даследавання»;

– «Паэтыка мастацкага тэксту».

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Мастацкі тэкст у гістарычным кантэксце» магістранты мусяць

*ведаць:*

– асноўныя тыпы кантэкстаў, якія ўплываюць на развіццё мастацкай літаратуры;

– найважнейшыя літаратурныя напрамкі, плыні, школы і стылі ад Антычнасці да эпохі Асветніцтва, а таксама іх адметныя рысы;

– літаратурныя жанры, сістэмы, сродкі мастацкай выразнасці ў кантэксце суаднясення з гістарычнай эпохай;

– творчасць найбуйнейшых аўтараў замежнай літаратуры і этапныя мастацкія тэксты, якія адлюстроўваюць адпаведныя гісторыка-культурныя працэсы ў грамадстве;

– найбольш важныя заканамернасці літаратурнага працэсу, якія ўплываюць на стварэнне мастацкага тэксту на розных гістарычных этапах;

*умець:*

– атрыбутаваць мастацкі тэкст таму ці іншаму літаратурнаму напрамку, плыні, школе, стылю з улікам эпохі яго стварэння, аўтарства, суаднесенасці з гісторыка-культурным кантэкстам;

– вызначаць эстэтычную каштоўнасць твораў мастацкай прозы і здабываць з іх гістарычную, эстэтычную і культуралагічную інфармацыю;

– выяўляць і аналізаваць філасофскія, рэлігійныя, палітычныя і іншыя ідэі і канцэпцыі, уласцівыя эпохе, якія знайшлі мастацкае ўвасабленне ў літаратурным творы;

– выкарыстоўваць назапашаны вопыт для развіцця навыкаў навукова-даследчай дзейнасці пры рабоце з мастацкім творам.

*валодаць:*

– культурай разумення асаблівасцей нацыянальнага і гістарычнага кантэкстаў і іх уплыву на мастацкую літаратуру;

– навыкамі супастаўлення гісторыка-культурнага кантэксту і літаратурнага твору;

– адпаведнай літаратуразнаўчай тэрміналогіяй.

У адпаведнасці з адукацыйным стандартам па спецыяльнасці 7-06 0232-02 «Літаратуразнаўства» вывучэнне вучэбнай дысцыпліны накіравана на фарміраванне наступных кампетэнцый:

СК-4 – Скарыстоўваць веданне літаратурнага працэсу як сістэмы ў гісторыка-культурным кантэксце для вырашэння прафесійных задач.

У адпаведнасці з вучэбным планам спецыяльнасці 7-06 0232-02 «Літаратуразнаўства» агульная колькасць гадзін, якія адведзены на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Мастацкі тэкст у гістарычным кантэксце», складае 112 акадэмічных гадзін, з якіх колькасць аўдыторных гадзін скаладе 46 гадзін (вочная форма навучання) і 10 гадзін (завочная форма навучання). Самастойная праца студэнтаў плануецца ў аб'ёме 66 акадэмічных гадзін (вочная форма навучання) і 102 гадзіны (завочная форма навучання).

Вучэбная дысцыпліна вывучаецца на працягу аднаго (першага) семестра.

Формай атэстацыі па вучэбнай дысцыпліне з'яўляецца дыферэнцыраваны залік па заканчэнні семестра. Працаёмкасць вучэбнай дысцыпліны «Мастацкі тэкст у гістарычным кантэксце» складае 3 заліковых адзінкі.

Форма атрымання вышэйшай адукацыі – вочная / завочная.

Заняткі праводзяцца на беларускай / рускай мовах.